7 (132)
ліпень

Выдаецца
са студзеня 1993 г.

# БЕЛАРУСКІ ГІСТАРЫЧНЫ ЧАСОПІС

*Пасведчанне
аб рэгістрацыі
№ 1221 ад
8 лютага 2010 г.*

Выходзіць 12 разоў
у год (з ліпеня 2003 г.)

НАВУКОВЫ, НАВУКОВА-МЕТАДЫЧНЫ ІЛЮСТРАВАНЫ ЧАСОПІС

**Заснавальнікі:**

**Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, рэспубліканскае унітарнае прадпрыемства «Выдавецтва «Адукацыя і выхаванне», дзяржаўная навуковая ўстанова «Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі», Беларускі дзяржаўны універсітэт**

***Рэдакцыйная калегія:***

*Галоўны рэдактар Васіль Кушнер*

**Сымон Барыс** (рэдактар аддзела), **Канстанцін Бандарэнка, Пётр Брыгадзін, Рыгор Васілевіч, Максім Гальпяровіч** (намеснік галоўнага рэдактара), **Анатоль Грыцкевіч, Мікалай Забаўскі, Віктар Іўчанкаў, Аляксандр Каваленя, Міхаіл Касцюк, Уладзімір Клюня, Веньямін Космач, Уладзімір Кошалеў, Надзея Кушнер** (рэдактар аддзела), **Уладзімір Ладысеў, Рыгор Лазько, Аляксандр Лакотка, Аляксей Літвін, Анатоль Люты, Барыс Ляпешка, Вольга Ляўко, Ігар Марзалюк, Наталля Матусевіч, Аляксандр Радзькоў, Аркадзь Русецкі, Вячаслаў Селяменеў, Аляксандр Смолік, Васіль Стражаў, Сяргей Ходзін, Мечыслаў Часноўскі, Алег Яноўскі, Эдмунд Ярмусік.**

***Рэдакцыйная рада:***

**Уладзімір Адамушка, Тамара Анціховіч, Юрый Бохан** (старшыня рады), **Васіль Бушчык, Марыя Бяспалая, Аляксандр Вабішчэвіч, Ала Галубовіч, Надзея Ганушчанка, Уладзімір Гілеп, Аляксандр Груша, Аляксандр Гужалоўскі, Вячаслаў Даніловіч, Таісія Доўнар, Дзяніс Дук, Ларыса Жэрка, Андрэй Каракін, Аляксандр Каханоўскі, іван Крэнь, Валерый Марозаў, Святлана Марозава, Леанід Мартынаў, Ян Мілеўскі, Антон Мірановіч, Сяргей Новікаў, Вольга Нячай, Васіль Ракуць, Сяргей Рашэтнікаў, Таццяна Румянцава, Віталь Скалабан, Алег Слука, Мікалай Сташкевіч, Валерый Талкачоў, Уладзімір Тугай, Віктар Фядосік, Анатоль Шаркоў, Захар Шыбека.**

## ЗМЕСТ

ДА 600-ГОДДЗЯ ГРУНВАЛЬДСКАЙ БІТВЫ

Руслан Гагуа — Грунвальдская бітва 1410 года — 3

Юрый Бохан — Да пытання аб некаторых дыскусійных момантах Грунвальдскай бітвы 1410 года — 15

ВАЕННАЯ ГІСТОРЫЯ

Сяргей Новікаў — Магілёўская бітва 1941 года ў данясеннях вермахта — 23

ЭТНАГРАФІЯ

Аляксандр Кушнір, Ігар Чаквін — Этнагістарычныя асаблівасці фарміравання антрапалагічных рыс насельніцтва Беларусі — 35

## ДЗЯРЖАВА І ПРАВА

| | | |
|---|---|---|
| Анатоль Шаркоў | Нацысцкія злачынцы перад судом ваенных трыбуналаў у Беларусі ў 1945—1950 гг. | 41 |

## МЕТОДЫКА. ВОПЫТ

| | | |
|---|---|---|
| Венера Варановіч | Актыўныя формы і метады педагагічнага ўзаемадзеяння суб'ектаў адукацыйнага працэсу пры вывучэнні гісторыі і грамадазнаўству | 51 |
| Валянціна Капанёва | Работа рэсурснага цэнтра па гісторыі | 55 |
| Аляксандр Раковіч | Выкарыстанне інфармацыйных тэхналогій на ўроках гісторыі | 58 |
| Галіна Руціч | Актыўныя метады выкладання гісторыі ў агульнаадукацыйнай школе | 61 |
| Надзея Капуза | Асаблівасці выкарыстання інтэрактыўных метадаў навучання на ўроках і ў пазакласнай дзейнасці па гісторыі | 65 |
| Галіна Сарокіна | Праектнае навучанне ў школе | 68 |
| Ірына Сіманава | Арганізацыя навукова-даследчай дзейнасці школьнікаў | 75 |
| | Содержание | 79 |

*Да 600-годдзя Грунвальдскай бітвы*

Руслан ГАГУА

# ГРУНВАЛЬДСКАЯ БІТВА 1410 года



*ГАГУА Руслан Барысавіч — дацэнт кафедры гуманітарных навук, філасофіі і права Палескага дзяржаўнага універсітэта, кандыдат гістарычных навук. Нарадзіўся ў 1972 г. у г. Гродна. У 2001 г. закончыў гістарычны факультэт Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта імя Янкі Купалы. У 2005 г. — аспірантуру пры ім. У 2008 г. абараніў дысертацыю па тэме "Вялікая вайна з Тэўтонскім ордэнам: крыніцы і гістарыяграфія". Займаецца сярэдневяковай ваеннай гісторыяй і даследаваннем у галіне крыніцазнаўства, гістарыяграфіі. Аўтар больш за 40 навуковых публікацый, у тым ліку манаграфіі "Грюнвальд в источниках: Хроника конфликта Владислава, короля Польши, с крестоносцами в год Христов 1410..." (Пинск, 2009).*

У 2010 г. у шэрагу еўрапейскіх дзяржаў праходзіць святкаванне 600-годдзя Грунвальдскай бітвы — адной з буйнейшых бітваў Сярэдневякоўя. Яна адбылася 15 ліпеня 1410 г. і адыграла значную ролю ў гісторыі Беларусі, Польшчы, Літвы, Чэхіі, Германіі. Грунвальдская бітва стала вынікам уварвання аб'яднанага войска Каралеўства Польскага і ВКЛ у землі Тэўтонскага ордэна, якое саюзнікі ажыццявілі падчас так званай Вялікай вайны 1409—1411 гг. і прывяла да бліскучай перамогі над крыжакамі.

### Крыніцы па гісторыі Грунвальдскай бітвы

Да цяперашняга часу захаваўся шырокі фонд крыніц для даследавання Грунвальдскай бітвы. На сённяшні дзень апублікавана і ўведзена ў навуковы зварот каля 100 летапісных паведамленняў пра гэтую падзею. У большасці з іх прыводзяцца вельмі кароткія і недакладныя, а часам проста фантастычныя звесткі. Падрабязнае апісанне Вялікай вайны 1409—1411 гг. утрымліваюць толькі тры хронікі, якія з'яўляюцца асноўнымі крыніцамі для яе вывучэння.

Самае падрабязнае апісанне Грунвальдскай бітвы змешчана ў "Гісторыі Польшчы" польскага храніста Яна Длугаша. Неабходна адзначыць, што ён нарадзіўся ў 1415 г., праз чатыры гады пасля завяршэння вайны, калі памяць пра мінулыя падзеі была яшчэ досыць моцнай, у сям'і польскага рыцара Іагана з Нядзельска, герба Пярсціна (Вянова). Бацька Я.Длугаша ўдзельнічаў у Грунвальдскай бітве і праславіўся тым, што захапіў у палон камандзіра брандэнбургскай харугвы Ордэна — Маркварда фон Зальцбаха, комтура Брандэнбурга, які з'яўляўся асабістым ворагам вялікага князя літоўскага Вітаўта, з некалькімі рыцарамі і самім сцягам[1]. Дзядзька храніста, Барталамей Клабуцкі, таксама прымаў удзел у бітве, быў капеланам — ваенным святаром.

З 1431 г. Я.Длугаш працаваў у канцылярыі кракаўскага біскупа Збігнева Алясьніцкага, што адкрыла яму доступ да розных дзяржаўных і царкоўных дакументаў. Магчымасць выкарыстоўваць актавыя матэрыялы, а таксама асабістае знаёмства з людзьмі, якія ўдзельнічалі ў Вялікай вайне 1409—1411 гг., такімі як Збігнеў Алясьніцкі, дзядзька Яна — Барталамей Клабуцкі і іншыя, дазволіла храністу стварыць самае значнае апісанне Вялікай вайны з Тэўтонскім ордэнам у сярэдневяковым летапісанні[2].

У 1436 г. Я.Длугаш стаў кракаўскім канонікам і пры гэтым выконваў шэраг адміністрацыйных функцый у капітуле Кракава. Тут ён атрымаў доступ да капітулярнага архіва і бібліятэкі, у якой захоўваліся

спісы з ранніх польскіх летапісаў. З 1448 г. Я.Длугаш працуе над стварэннем "Прускіх харугваў" ("Banderia Pruthenorum"). У гэтым рукапісе змешчана апісанне сцягоў, захопленых падчас Грунвальдскай бітвы і ў бітве пад Коранавым у 1410 г., а таксама чатырох харугваў, захопленых у бітве пад Наклам 13 верасня 1431 г. Я.Длугаш загадаў намаляваць харугвы на пергаменце і напісаў да іх тлумачэнні[3]. Да гэтага часу "Прускія харугвы" Я.Длугаша з'яўляюцца ўнікальнай крыніцай. Гэта адзіны ў сваім родзе збор эпохі сярэдніх вякоў, які змяшчае дакладныя малюнкі ваенных сцягоў таго часу.

Самы вялікі і значны твор Я.Длугаша — "Гісторыя Польшчы" быў напісаны ў перыяд паміж 1455 і 1480 гг. Падзеі, звязаныя з Вялікай вайной, апісваюцца ў дзесятай і адзінаццатай кнігах дванаццацітомнай працы польскага храніста. У 1962 г. выдавецтвам Акадэміі навук СССР была апублікавана ў перакладзе на рускую мову частка "Гісторыі Польшчы", у якой апавядаецца пра падзеі з 1386 па 1411 г., што зрабіла даступнай дадзеную крыніцу для айчынных даследчыкаў і ўсіх, хто цікавіцца гісторыяй сярэдніх вякоў[4]. У сваім творы Я.Длугаш вельмі падрабязна апісаў дыпламатычную і ваенную барацьбу Польскага каралеўства і Вялікага княства Літоўскага супраць Тэўтонскага ордэна. Некаторыя дакументы, якія мелі дачыненне да апісваемых падзей, былі прыведзены ім у творы часткова ці цалкам.

Хоць у сваёй "Гісторыі Польшчы" Я.Длугаш стварыў самае вялікае па аб'ёме апісанне Грунвальдскай бітвы, больш заслугоўваюць даверу іншыя крыніцы — "Торуньскія аналы", працяг нямецкай хронікі Яна фон Пасільге і польская ананімная "Хроніка канфлікту Уладзіслава, караля Польшчы, з крыжакамі ў год Хрыстоў 1410..." (далей - "Хроніка канфлікту...").

З усіх наратыўных крыніц, якія былі прысвечаны падзеям 15 ліпеня 1410 г., як заходнееўрапейскімі храністамі, так і летапісцамі з Усходняй Еўропы, цэнтральнае месца варта адвесці "Хроніцы канфлікту...".

"Хроніка канфлікту..." на дадзены момант з'яўляецца адным з самых падрабязных і дакладных апісанняў Грунвальдскай бітвы. Створаная ў перыяд з лістапада 1410 па студзень 1411 г. невядомым відавочцам падзей, па ўсёй верагоднасці, віцэ-канцлерам Польскага каралеўства Мікалаем Тромбай, хроніка разам з летапіснай і эпісталярнай спадчынай Польскага каралеўства і Тэўтонскага ордэна, з'яўляецца галоўнай крыніцай апісання бітвы для "бацькі польскай гісторыі" Я.Длугаша і застаецца асноўнай крыніцай рэканструкцыі падзей Грунвальдскай бітвы для сучасных даследчыкаў.

Дадзены твор не з'яўляецца толькі летапісным наратывам. Ён спалучае ў сабе рысы хронікі, своеасаблівага дзённіка ваенных дзеянняў, што пазней — у XVI—XVIII стст. здабылі вялікую папулярнасць у Рэчы Паспалітай, і рыцарскага рамана, які ўсхваляе Ягайлу і адзін з самых знакамітых яго ваенных поспехаў.

"Хроніка канфлікту..." дазваляе высветліць шэраг пытанняў адносна Грунвальдскай бітвы, якія да гэтага часу насілі дыскусійны характар, і пазбавіцца ад тых непаразуменняў, якія дапусціў у сваім творы Я.Длугаш, што ў далейшым стварылі глебу для рознагалоссяў сярод даследчыкаў Грунвальдскай бітвы пры яе рэканструкцыі[5].

У Тэўтонскім ордэне падзеі, звязаныя з ваеннымі дзеяннямі 1410 г., атрымалі адлюстраванне ў некалькіх летапісных спісах, сярод якіх, у першую чаргу, варта адзначыць "Торуньскія аналы" і "Хроніку Прускіх земляў" Яна фон Пасільге.

Рукапіс, які атрымаў назву "Торуньскія аналы", быў знойдзены ў Гданьскім гарадскім архіве ў спісе, датаваным другой чвэрцю XVI ст. У пачатку манускрыпту адной і той жа рукой на лацінскай мове былі апісаны падзеі з 941 па 1410 г. уключна, на палях і пасля асноўнага тэксту маюцца разрозненыя запісы да 1540 г., зробленыя рознымі почыркамі, якія дапаўняюць асноўны тэкст. Далей у манускрыпце змешчаны спісы вялікіх магістраў Тэўтонскага ордэна да XVI ст. уключна і іншыя матэрыялы. На жаль, у "Торуньскіх аналах" ваенныя падзеі 1410 г. апісаны залішне лаканічна[6].

"Хроніка Прускіх зямель" Яна фон Пасільге, афіцыяла (духоўнага суддзі) замка Гум, першапачаткова была напісана на лацінскай мове, але дайшла да нас у больш позніх спісах у перакладзе на нямецкую мову. Пачатковы тэкст, аўтарам якога быў Ян фон Пасільге, які памёр, верагодна, у 1405 г., быў перакладзены на верхне-сярэдне-нямецкую мову і прадоўжаны невядомай асобай.

Прадаўжальнік хронікі Яна фон Пасільге быў добра інфармаваны аб падзеях і справах Тэўтонскага ордэна. Верагодна, ён меў доступ да афіцыйных дакументаў Ордэна і як аўтар "Торуньскіх аналаў" з'яўляўся сучаснікам падзей. Апісанне Грунвальдскай бітвы, змешчанае ў прадаўжэнні хронікі Яна фон Пасільге, выклікае асаблівую цікавасць, паколькі ўтрымлівае найбольш поўную і дакладную версію падзей, прадстаўленую храністамі Ордэна[7].

Летапісныя сведчанні пра Грунвальдскую бітву дапаўняюцца яшчэ дзвюма групамі крыніц: лістамі і данясеннямі, а таксама актавым матэрыялам таго часу. Агульная колькасць апублікаваных на цяперашні час крыніц для рэканструкцыі падзей Вялікай вайны, як прамых, так і ўскосных, дасягае 130— 140. Таксама існуюць неапублікаваныя манускрыпты, якія захоўваюцца ў еўрапейскіх архівах.

**Перадгісторыя Вялікай вайны 1409—1411 гг.**

Тэўтонскі ордэн быў заснаваны ў Палесціне ў канцы XII ст. У 1228 г. яго рыцары з'явіліся ў Прусіі па запрашэнню князя Конрада Мазавецкага для абароны яго ўладанняў ад набегаў ваяўнічых прускіх плямёнаў. У наступныя 10 гадоў на берагах Віслы былі пабудаваны ордэнскія замкі Торунь, Кульм, Марыенвердэр, Эльблонг, Бальга і інш. Сілай зброі падпарадкоўваючы мясцовае язычніцкае насельніцтва, крыжакі захоплівалі яго землі ва ўладанне альбо пакідалі былым уладальнікам на аснове васалітэту ці платы даніны[8]. У 1237 г. адбылося зліццё Тэўтонскага ордэна з Ордэнам мечаносцаў (Інфлянцкім ордэ-

нам), які ўжо 35 гадоў існаваў у ніжнім Падзвінні, але быў моцна аслаблены паражэннем ад жамойтаў у бітве пры Шаулях 1236 г.[9].

Тэўтонскай ордэн у сярэдзіне XIII ст. увайшоў у канфрантацыю з Вялікім княствам Літоўскім, якая зацягнулася амаль на два з чвэрцю стагоддзі. Ужо ў 1260 г. крыжакі распачалі буйнамаштабную экспедыцыю ў жамойцкія землі, але паражэнне пры возеры Дурбе прымусіла Ордэн на некаторы час адмовіцца ад планаў экспансіі ў адносінах да гэтых тэрыторый[10].

Пасля канчатковага падпарадкавання Прусіі ў 1283 г. увага крыжакоў накіроўваецца на землі ВКЛ, крыжацкія паходы супраць княства набываюць сістэматычны характар. Менавіта пад гэтым годам ордэнскі храніст Пётр з Дусбурга адзначыў: "Скончылася вайна пруская, распачалася вайна літоўская"[11]. У той жа час рыцары Ордэна дзеля дасягнення сваёй галоўнай мэты — стварэння ўласнай моцнай дзяржавы — праводзілі актыўную знешнюю палітыку. У 1309 г., карыстаючыся слабасцю феадальна раздробленай Польшчы, крыжакі захапілі Гданьскае памор'е, што прывяло да канфлікту спачатку з польскім каралём Уладзіславам Лакеткам, а потым з яго сынам Казімірам Вялікім. Канфлікт скончыўся падпісаннем у 1343 г. мірнай дамовы ў Калішы. Па гэтаму пагадненню Памор'е заставалася за Ордэнам, у той час як да Польшчы вярталіся захопленыя крыжакамі Куявы і Добжыньская зямля[12]. Перамір'е дазволіла братам-рыцарам зноў сканцэнтраваць свае намаганні на агрэсіі супраць ВКЛ: з 1345 па 1377 гг. крыжакамі было здзейснена каля 100 выпраў на землі ВКЛ, з боку Княства былі арганізавана 42 рэйды ва ўладанні Ордэна[13].

У 1385 г. паміж Польскім каралеўствам і ВКЛ была заключана Крэўская унія, што выклікала значныя змяненні палітычнага становішча ва Усходняй Еўропе. Вялікі князь літоўскі Ягайла, ажаніўшыся з польскай каралевай Ядвігай, атрымаў у 1386 г. польскую карону, абавязаўшыся пры гэтым прыняць каталіцтва, ахрысціць большую частку яшчэ язычніцкага насельніцтва Літвы, вярнуць "усе адабраныя землі Польскага каралеўства, захопленыя кім-небудзь", а таксама "ўключыць у Карону на вечныя часы свае краіны — Літву і Русь"[14]. Гэтая унія, якая атрымала назву Крэўскай, дазволіла Польскаму каралеўству і ВКЛ аб'яднаць свае сілы для барацьбы з Тэўтонскім ордэнам[15].

### Пачатак Вялікай вайны 1409—1411 гг.

Ужо пад 1408 г. польскі храніст Я.Длугаш адзначыў павелічэнне напружання ў адносінах паміж Тэўтонскім ордэнам, з аднаго боку, і Польскім каралеўствам і ВКЛ, з другога[16]. Вайна з Ордэнам была непазбежнай. Новы вялікі магістр Тэўтонскага ордэна Ульрых фон Юнгінген (1407—1410 гг.), імкнуўся вырашыць канфлікт з ВКЛ канчаткова. З 1408 г. крыжакі фактычна пачалі падрыхтоўку да ваенных дзеянняў: умацоўваліся памежныя замкі ў Хельмскай зямлі; у Мальбарку была значна павялічана вытворчасць агнястрэльнай зброі; праводзілася разведка польскіх памежных тэрыторый[17]. Аб пераносе асноўнай увагі Ордэна на літоўска-польскі напрамак красамоўна сведчыць перадача Швецыі вострава Готланда і спыненне вайсковых дзеянняў на Балтыйскім моры[18]. Урэгуляванне адносін на поўначы давала Тэўтонскаму ордэну бяспеку тылоў для канцэнтравання і выкарыстання вайсковага патэнцыялу на літоўска-польскіх межах.

У ВКЛ таксама прытрымліваліся погляду, што пытанне Жамойці павінна быць вырашана пры дапамозе зброі. Паўстаўшая ў маі 1409 г. Жамойць была маланкава пазбаўлена войскамі ВКЛ ад крыжакоў[19]. Вядомы польскі даследчык Г.Лаўмяньскі, спасылаючыся на хроніку Яна фон Пасільге, прыйшоў да высновы, што паўстанне было арганізавана вялікім князем літоўскім Вітаўтам[20].

Дзеянні, запланаваныя і падрыхтаваныя Вітаўтам з мэтай вяртання сваёй улады над Жамойцю, прававодзіліся ў парушэнні Рацёнжскай дамовы 1404 г. Аднак крыжакі не спяшаліся з контрмерамі. Яны зрабілі спробу ізаляваць польскі бок ад умяшальніцтва ў канфлікт Тэўтонскага ордэна з ВКЛ. З мэтай высвятлення пазіцыі Польскага каралеўства ў адносінах да магчымага пачатку Ордэнам вайсковай аперацыі супраць ВКЛ Ульрых фон Юнгінген накіраваў да Ягайлы пасольства, якое заявіла, што вялікі магістр гатовы захоўваць Калішскі мір, заключаны паміж Польскім каралеўствам і Тэўтонскім ордэнам[21]. Аднак гэтая спроба аказалася няўдалай.

Пасля правядзення агульнапольскага сейма ў Ленчыцы, які быў сабраны для выпрацоўкі адказу вялікаму магістру 17 ліпеня 1409 г., Ягайла разаслаў скаргі на крыжакоў каталіцкім манархам Еўропы. Тэкст адной з такіх скаргаў, датаванай 10 жніўня, гэта значыць да пачатку вайсковых дзеянняў, цалкам прыведзены ў Я.Длугаша[22]. Ягайла ставіў пад сумненне не толькі права Тэўтонскага ордэна на хрышчэнне Жамойці і Літвы, але і права на само яго існаванне, матывуючы гэта тым, што крыжакі не толькі не кіруюцца грамадзянскімі законамі і царкоўнымі пастановамі, але і не адпавядаюць свайму прызначэнню як місіянерскай арганізацыі. Польскі кароль называў Ордэн пагрозай "усім дзяржавам і ўладанням" і выказваўся, што яго трэба "зацугліць", пакуль не позна. Парушэннем правоў Польскага каралеўства разглядаліся захопы замкаў Дрэздэнка і Сантока. Ягайла прасіў таксама не аказваць крыжакам дыпламатычную альбо вайсковую дапамогу.

Са зместу дадзенага дакумента зразумела, што для Польшчы вайна з Ордэнам здавалася непазбежнай. Адышлі ў мінулае спробы вырашыць спрэчныя пытанні мірным шляхам. Польскае пасольства, якое ўзначаліў гнезненскі архібіскуп Мікалай Куроўскі, прыбыло ў Мальбарк і заявіла вялікаму магістру, што калі ён пойдзе вайной на ВКЛ, Ягайла нападзе на Прусію, спаслаўшыся пры гэтым на сеньёрыяльныя абавязкі ў адносінах да Вітаўта[23].

Антаганізм паміж Польскім каралеўствам і ВКЛ, з аднаго боку, і Тэўтонскім ордэнам, з другога, да-



*Вітаўт на велікакняжацкім прастоле.* Мініяцюра 1555 г.

сягнуў свайго апагея. Беспаспяховыя спробы крыжакоў разарваць польска-літоўскую унію, усё больш вострыя супярэчнасці паміж ордэнскімі, польскімі і літоўскімі палітычнымі амбіцыямі, абранне вялікім магістрам ваяўнічага Ульрыха фон Юнгінгена непазбежна вялі да ўзброенага канфлікту. Захоп Вітаўтам Жамойці і афіцыйная падтрымка яго дзеянняў польскімі феадаламі сталі непасрэднымі прычынамі яго пачатку.

Фармальна вайну распачалі крыжакі. Адзначыўшы, што "лепш напасці на галаву, чым на члены", вялікі магістр Ордэна накіраваў да Ягайлы ў Карочын ліст аб разрыве мірнага пагаднення. Пасланне было атрымана польскім каралём 14 жніўня 1409 г.[24]. Вялікая вайна пачалася.

Пасля абвяшчэння вайны крыжакі рушылі ў польскія землі. Я.Длугаш датуе пачатак іх паходу 14 жніўня 1409 г.[25], хроніка Яна фон Пасільге — 16 жніўня[26]. За кароткі час войскі Ордэна занялі Добжыньскую зямлю. Наступным крокам стаў захоп выдатна ўмацаванага замка Быдгашч. Гэта адкрыла крыжакам шлях у Вялікую Польшчу[27]. Рыцары Ордэна кіраваліся традыцыйнай тактыкай усіх тагачасных армій: захоп плацдарма, замацаванне на ім, стварэнне ваеннай і прадуктовай базы з далейшым пераносам усіх вайсковых дзеянняў на варожую тэрыторыю.

Ягайла, у сваю чаргу, аб'явіў мабілізацыю. Адначасова ён, як паведамляе Я.Длугаш, не раз накіроўваў ганцоў да Вітаўта з просьбамі аказаць вайсковую падтрымку. 15 верасня вайсковыя атрады з Кракаўскай, Сандамірскай, Люблінскай земляў, а таксама атрады з Падолля і Русі былі сабраны ў Вельбажы, адкуль рушылі на Быдгашч. Нягледзячы на тое, што ВКЛ так і не аказала вайсковай дапамогі, Ягайла пасля васьмідзённай аблогі захапіў замак. Вяртанне польскім бокам Быдгашча мела вялікае ваеннае значэнне, бо перашкаджала ажыццяўленню стратэгічных планаў Ордэна, пазбаўляючы яго базы для рэйдаў на тэрыторыю Вялікай Польшчы.

На гэтым першы этап вайсковых дзеянняў быў завершаны з-за ўмяшальніцтва чэшскага караля Вацлава IV Люксембурга, які прапанаваў вырашыць польска-ордэнскія рознагалоссі ў якасці трацейскага арбітра. Абодва бакі згадзіліся на трацейскі суд. Рашэнне павінна было быць абвешчана 9 лютага 1410 г. у Празе. Паміж Тэўтонскім ордэнам і Польскім каралеўствам было ўсталявана перамір'е да 24 чэрвеня 1410 г.

Перамір'е ўспрымалася абодвума бакамі як тактычны ход. Крыжакі, відаць, спадзяваліся на вырашэнне Вацлавам IV Люксембургам пытання на іх карысць. Ягайла ставіў перад сабой задачу аб'яднацца з войскам Вітаўта. Аб гэтым красамоўна сведчыць той факт, што, усталяваўшы перамір'е ў кастрычніку, ужо ў лістападзе Ягайла накіроўваецца на перамовы з Вітаўтам у ВКЛ, дзе яны на сакрэтнай нарадзе ў Бярэсці 30 лістапада вызначылі ход будучай вайны з Тэўтонскім ордэнам, гэта значыць да абвяшчэння трацейскага рашэння. Без сумнення саюзнікамі планавалася непасрэднае ўварванне ў Прусію. У Я.Длугаша чытаем наступнае: "На дапамогу сабе ў будучай вайне яны прыцягваюць нават татарскага хана (Джэлаль-Ад-Дзіна. — **Р.Г.**) з татарскім племем, якога Аляксандр, князь літоўскі, прывёў у Бярэсце. Тут жа яны ўстанаўліваюць, у які дзень і ў якім месцы польскія і літоўскія войскі злучацца і якім спосабам пяройдуць Віслу. Акрамя гэтага, яны вырашаюць пабудаваць ніколі яшчэ небывалы навясны мост на лодках..."[28].

Трацейскае рашэнне, абвешчанае Вацлавам IV Люксембургам, не зняла супярэчнасці паміж Ордэнам і саюзнікамі. Тэкст рашэння быў згублены ўжо ў 1412 г. і, на думку польскага гісторыка С.Кучынскага, згублены з намерам[29]. Я.Длугаш перадае змест толькі двух артыкулаў трацейскага прысуду: "сам кароль рымлян Венцэслаў ... вызначае, што зямля Добжыньская, захопленая крыжакамі, належыць да перадачы з усімі замкамі і ўладаннямі ў яго ж (Венцэслава) рукі; а ён, валодаючы ёю, павінен на працягу года абдумаць і, абдумаўшы, вырашыць, каму павінна належаць права валодання гэтай зямлёй. Выклікае здзіўленне ўмова, што Польскае каралеўства больш ніколі не павінна абіраць сабе караля з Літвы альбо з усходніх краін, але толькі аднаго з "заходніх гаспадароў"[30]. Іншыя крыніцы паведамляюць, што кожны з бакоў захоўваў за сабой права на уладанні, якія належалі ім да вайны, што нельга карыстацца дапамогай "няверных" і дапамагаць ім супраць другога боку. Хроніка Яна фон Пасільге дадае яшчэ пункты, якія датычацца замка Дрэздэнка і ўзгадкі пра Памор'е ў тытуле польскага караля. Ордэн павінен быў вярнуць Добжыньскую зямлю, але Поль-

шча назаўсёды пазбаўлялася права на Жамойць[31].

Хоць сапраўдны змест рашэння ўстанавіць немагчыма, відавочна, што ніводзін з вышэй прыведзеных варыянтаў не мог задаволіць польска-літоўскі бок. Працяг вайны здаваўся непазбежным, таму абодва праціўніка, карыстаючыся перамір'ем, не спынялі падрыхтоўку да вайсковых дзеянняў.

І Тэўтонскі ордэн, і Польскае каралеўства вялі перамовы з Венгрыяй. Спрабуючы знішчыць таемнае пагадненне аб нападзе на Польшчу ў выпадку вайны апошняй з Ордэнам, якое было падпісана паміж венгерскім каралём Сігізмундам Люксембургам і Ульрыхам фон Юнгінгенам у 1409 г., польска-літоўскае пасольства на чале з Вітаўтам сустрэлася ў Кежмарке з венгерскім каралём[32]. Сігізмунд Люксембург заявіў вялікаму князю літоўскаму, што яму "нельга будзе захаваць умовы міру, калі крыжакі падвергнуцца нападу". Высветліўшы яго стаўленне, Ягайла сфарміраваў гарнізон з рыцараў Бежскай зямлі, які ўзначаліў Ян са Шчакочына. Гарнізон павінен быў абараняць Польшчу з паўднёвага боку ад верагоднага нападу венгерскіх войскаў падчас прускай выправы. Забяспечыўшы тылы, Ягайла аб'явіў усеагульную мабілізацыю. Была таксама праведзена вярбоўка наёмнікаў, якія пачыналі адыгрываць усё больш значную ролю ў еўрапейскіх арміях з канца XIV ст. Актыўна праводзілася прапаганда, вынікам якой стаў пераход польскіх рыцараў, якія знаходзіліся на службе ў венгерскага караля ў войска Польскага каралеўства, у тым ліку такіх знакамітых, як Януш Бжозагаловы і Завіша Чарны.

Заканчэнне перамір'я паклала пачатак новым сутычкам, але ўварванне адбылося пазней. 1 ліпеня 1410 г. войскі Польскага каралеўства і ВКЛ, а таксама мазавецкіх князёў Януша і Земавіта і наёмнікаў з Чэхіі, сабраўшыся каля Казеніцаў, пачалі перапраўляцца цераз Віслу па пантонным мосце. Пераправа заняла тры дні[33]. Рух саюзных войскаў у глыбіню тэрыторыі праціўніка суправаджаўся баявымі вылазкамі асобных атрадаў, якія прыводзілі да сутыкненняў з гарнізонамі прускіх крэпасцяў. Так, атрад Януша Бжозагаловага, заманіўшы крыжакоў з замка Свецэ ў засаду, разбіў іх, узяўшы ў палон пры гэтым пяць братоў Ордэна. Аднак такія вылазкі не заўсёды прыходзілі паспяхова: 13 ліпеня калішскі ваявода Мацей з Вонсаша ўварваўся ў Памеранію, але быў разбіты фогтам Новай Маркі Міхаэлем Кухмайстарам[34].

Варта заўважыць, што крайняя жорсткасць з'яўлялася неад'емнай часткай вайсковых выпраў таго часу. Польска-літоўскія войскі не былі выключэннем і мала адрозніваліся ў гэтым плане ад крыжакоў. У населеных пунктах, якія захопліваліся і падлягалі рабаванню, мужчын часта знішчалі, а жанчын гвалцілі. Паводле Я.Длугаша, "літоўцы і татары спустошалі гэту вобласць як варожую, з варварскай жорсткасцю, забіваючы не толькі дарослых, але і юнакоў і нават немаўлятак, якія плакалі ў калысках. Іншых разам з маткамі яны прымусова бралі ў палон, у свае намёты, як ворагаў і іншаземцаў, хоць жыхары гэтай



*Польскі кароль Уладзіслаў Ягайла.*
Фрагмент фрэскі ў Кракаўскім замку Вавель. Канец XV ст.

вобласці былі людзі польскага племені і мовы. Маці забітых немаўлятак прыходзілі да каралеўскага намёту з распушчанымі валасамі і з гучным ляментам аплаквалі забойства сваіх дзяцей"[35]. Пры апісанні захопу Дамброўна храніст адзначае: "Яшчэ не ўся здабыча была вывезена, як горад быў падпалены, і многія людзі, якія шукалі прыстанішча ў царкве, загінулі ў полымі. Многа тысяч людзей абодвух палоў было захоплена ў палон, прыведзена ў каралеўскі лагер і перададзена каралю польскаму Уладзіславу. Больш за тое, многія падвергліся разне, і ніхто не пазбегнуў гібелі альбо палону, акрамя тых, хто ў чаўнах і лодках збеглі па возеры. Тут не рабілі аніякай павагі да ўзросту, ніякай літасці да яго, бо палякі следавалі тут не столькі праву вайны, колькі, сумуючы аб Добжыньскай зямлі, выпаленай ворагамі, вылівалі сваю нянавісць да крыжакоў[36].

Рухаючыся ў напрамку Мальбарка, саюзнікі 10 ліпеня 1410 г. дасягнулі возера Рубкава, дзе адбылася нарада. На час выправы была абрана вайсковая рада з васьмі чалавек. У яе склад увайшлі кароль польскі Ягайла, вялікі князь літоўскі Вітаўт, кракаўскі кашталян Крысцін з Вострава, кракаўскі ваявода Ян з Тарнава, познаньскі ваявода Седзівой з Астрарога, падканцлер Польскага каралеўства Мікалай Тромба, маршалак Польскага каралеўства Збігнеў з Бжэзя і кракаўскі падкаморнік Пётр Шафранец з Пескавай скалы. Таксама на нараду былі запрошаны два праваднікі — Траян з Краснастава і Ян Грунвальд з Парчава.

У гэты ж час, верагодна, было вырашана і пытанне аб далейшым руху войскаў. На шляху саюзнікаў, за ракой Дрвенцай, Ульрых фон Юнгінген размясціў сваю армію. Абодва берагі ў месцы верагоднай пераправы польска-літоўскіх сіл былі ўмацаваны частаколам[37]. Разлік вялікага магістра быў просты і відавочны. Калі б Ягайла з Вітаўтам паспрабавалі фарсіраваць Дрвенцу, крыжакі апынуліся б у значна больш зручнай пазіцыі, што скончылася б, верагодна, іх перамогай. Аднак саюзнікі такую спробу не здзейснілі. Замест гэтага на світанку 11 ліпеня польска-літоўская армія павярнула назад[38]. Абышоўшы Дрвенцу каля вытокаў, яна дасягнула 13 ліпеня месца Дамброўна, якое было захоплена і спалена[39]. Крыжакі ў гэты час рухаліся паралельна саюзным войскам па супрацьлеглым беразе ракі. Праціўнікі сустрэліся на світанку 15 ліпеня на полі паблізу селішчаў Людвікава, Таненберг і Грунвальд. У трохкутніку гэтых вёсак і адбылася адна з найбуйнейшых бітваў Сярэдневякоўя.

## Грунвальдская бітва

### Расстаноўка сіл

Асноўную ролю ў еўрапейскіх арміях пачатку XV ст. прадаўжала адыгрываць, як і на працягу ўсяго Сярэдневякоўя, рыцарская кавалерыя. У тыя часы гаварылі, што "сто конных вартыя тысячы пешых вояў"[40]. На думку нямецкага гісторыка Вайца, зусім без пяхоты ваенныя дзеянні ў Сярэдневякоўі ніколі не абыходзіліся, але яе звычайна выкарыстоўвалі толькі пры абароне або ў вайне, на якую заклікалі ўсіх, хто мог трымаць зброю; у выправах жа яна ўдзельнічала толькі ў выглядзе выключэнняў[41].

У Польскім каралеўстве пачатку XV ст. вайсковая павіннасць распаўсюджвалася на ўсіх землеўладальнікаў і мяшчан, а таксама на войтаў і солтысаў[42]. Аб вайсковай павіннасці ў ВКЛ мы маем магчымасць даведацца з прывілею Ягайлы феадалам ВКЛ каталіцкага веравызнання. Дакумент паведамляе, што "згодна старажытнаму звычаю вайсковая выправа застаецца абавязкам, які здзяйсняецца асабістымі затратамі і расходамі. У тым жа выпадку, калі прыйдзецца праследаваць ворагаў нашых, якія б уцякалі з нашай літоўскай зямлі, то для гэтага віду праследавання, якое па старажытнаму народнаму звычаю завецца пагоняй, абавязуюцца накіроўвацца не толькі рыцары, але і кожны мужчына, якога б ён ні быў паходжання ці стану, толькі б ён быў здольны насіць зброю"[43].

Без сумнення, харугвы ВКЛ пад Грунвальдам складаліся выключна з конных рыцараў. Тое ж самае можна сказаць і пра польскую армію. Нягледзячы на тое, што мяшчане выконвалі вайсковую службу, у вайсковых выправах яны, як правіла, не выкарыстоўваліся. Такое становішча было характэрным для ўсёй Сярэдневяковай Еўропы[44].

Крыжацкая конніца складалася з рыцараў Ордэна, гасцей з розных краін Еўропы і значнай колькасці наёмнікаў[45]. Акрамя кавалерыі, якая складала асноўную баявую моц крыжацкага войска, у вайсковых дзеяннях 1410 г. прымала ўдзел таксама пяхота. У гарадах з рамеснікаў складаліся атрады па 10 чалавек у кожным. Некалькі такіх дзесяткаў складалі больш буйныя тактычныя адзінкі — майгі, якімі камандавалі прызначаемыя капітаны. Такая прысутнасць мяшчан была хутчэй выключэннем, чым правілам. Толькі надзвычай цяжкое становішча, якое патрабавала максімальнай мабілізацыі ўсіх сіл Ордэна, прымусіла вялікага магістра вывесці ў поле ўзброеных рамеснікаў.

У 1417 г. летапісец занатаваў у гарадской хронікі Эльблонга, што ў Грунвальдскай бітве загінула 550 мяшчан з гэтага горада. Адбылося гэта, паводле яго слоў, таму, што "гаспадар вялікі магістр даслаў поўны заклапочанасці ліст, у якім загадаў кожнаму, хто тут жыве, прыгатавацца і рушыць на вайну ў імя любові, дабра і гонару." Яны ж, "роўна як старыя, так і маладыя не маглі гэтаму супярэчыць"[46].

Наяўнасць пяхоты ў войсках Ордэна сведчыць аб якаснай перавазе польска-літоўскага войска, таму што ні адзін з сярэдневяковых радоў войск не могараўнацца з рыцарамі, і кожнаму з іх пагражала непазбежная гібель у выпадку сутыкнення з рыцарамі пры роўных умовах[47].

Арганізацыя абодвух войскаў была падобнай і адпавядала вайсковым еўрапейскім стандартам таго часу. Найменшым вайсковым злучэннем з'яўлялася "кап'ё", якое было хутчэй не баявой, а колькаснай адзінкай і складалася з трох вершнікаў[48]. Коп'і аб'ядноўваліся ў больш буйныя атрады, якія мелі свой сцяг і зваліся харугвамі. Харугвы строіліся "клінамі" ў баявыя парадкі[49].

Узбраенне абодвух войскаў амаль не адрознівалася адно ад аднаго, хоць ў гістарычнай літаратуры распаўсюджаны погляд, паводле якога харугвы ВКЛ мелі "лягчэйшае" ўзбраенне, чым атрады польскага рыцарства і крыжакі[50]. У той жа час даследаванне расійскага гісторыка А.М.Кірпічнікава абвяргае думку замежных гісторыкаў і паказвае, што рускае і літоўскае ўзбраенне і метады вядзення бою развіваліся згодна агульнаеўрапейскім традыцыям[51]. І крыжакі, і саюзнікі падчас Грунвальдскай бітвы выкарыстоўвалі артылерыю[52].

Адсутнасць у крыніцах дакладных і заслугоўваючых даверу даных аб колькасці войскаў, якія ўдзельнічалі з абодвух бакоў у Грунвальдскай бітве, стварыла ў гістарычнай літаратуры сітуацыю, пры якой яна вызначаецца рознымі даследчыкамі ад 11 000 да 83 000 чалавек з боку Ордэна і ад 16 500 да 163 000 вояў з боку саюзнікаў адпаведна[53].

Паводле сведчання Я.Длугаша, у Грунвальдскай бітве ўдзельнічала 50 польскіх (разам з наёмнікамі) і 40 літоўскіх (уключаючы татараў) харугваў супраць 51, выстаўленых крыжакамі[54]. У любым выпадку саюзнае аб'яднанае войска як колькасна (амаль у 2 разы), так і якасна пераўзыходзіла войска Ордэна.

Сістэма камандавання ўзброенымі сіламі Ордэна выцякала з самой яго структуры. На чале духоўна-рыцарскай арганізацыі стаяў вялікі магістр. Вялікі



*Вялікі магістр Тэўтонскага ордэна.*



*Рыцары Тэўтонскага ордэна.*

комтур, яго бліжэйшы саветнік, а пры неабходнасці, намеснік вялікага магістра, кіраваў гаспадарчымі справамі і назіраў за паводзінамі братоў Ордэна і служыцелямі. Наступным у іерархіі Ордэна быў вялікі маршал у Кёнігсбергу, які з'яўляўся намеснікам магістра ў якасці галоўнакамандуючага ваеннымі сіламі Ордэна. Ніжэй знаходзіліся вялікі шпітальнік, інтэндант, які заведваў вайсковай маёмасцю Ордэна, скарбнік і кашталян, які з'яўляўся начальнікам комтураў[55].

У бітве пры Грунвальдзе вярхоўнае камандаванне крыжацкім войскам ажыццяўляў непасрэдна вялікі магістр Ордэна Ульрых фон Юнгінген.

Вярхоўным камандуючым польска-літоўскіх войскаў з'яўляўся польскі кароль Ягайла. Варта пры гэтым заўважыць, што польскае рыцарства кіравалася каралём не толькі намінальна, але і фактычна.

Перад бітвай менавіта Ягайла аддаў загад зрабіць воям павязкі з саломы, каб адрозніваца ад праціўніка, і абвясціў баявы кліч для палякаў — "Кракаў!", для літоўцаў — "Вільня!", ён жа расстаўляў харугвы польскага крыла ў баявыя парадкі[56], а напрыканцы бітвы аддаў загад аб праследаванні ворага[57].

Аднак польскае і літоўскае крылы саюзнага войска пачалі бой паасобку, у розны час, і дзейнічалі ў бітве нескаардынавана, што паказвае на феадальны характар узаемаадносін у польска-літоўскіх войсках падчас бою, г. зн. харугвамі ВКЛ камандаваў вялікі князь літоўскі Вітаўт[58].

## Ход бітвы

15 ліпеня 1410 г. саюзныя войскі сустрэліся з арміяй крыжакоў на Грунвальдскім полі паміж вёскамі Таненберг, Людвікава і Грунвальд.

Саюзныя войскі, падышоўшы да вёскі Людвікава каля 8 ці 9 гадзіны раніцы, выявілі праціўніка і пачалі спешна разварочвацца ў баявы строй. Войска ВКЛ стварыла правае крыло, Польскага каралеўства — левае[59]. Пастраенне да бітвы зацягвалася, саюзнікі не атакавалі, што не адпавядала планам вялікага магістра. Таму крыжакі, правакуючы атаку, даслалі Вітаўту і Ягайлу два мячы, паказваючы тым самым, што бітва непазбежна.

На першым этапе бітвы адбыўся конны ўдар правага крыла з боку саюзнікаў, якое займалі харугвы Вялікага княства Літоўскага пад камандаваннем Вітаўта, па леваму крылу — войска крыжакоў, якое займалі харугвы, складзеныя з элітарнага рыцарства пад камандаваннем вялікага маршала Тэўтонскага ордэна Фрыдрыха фон Валенрода. У бой былі ўцягнуты таксама два атрады з польскага крыла — харугва пярэдняй варты пад малым сцягам з белым арлом і харугва Святога Георгія, якая складалася з чэшскіх і мараўскіх наёмнікаў.

Пасля бязлітаснага бою, які доўжыўся, відаць, каля гадзіны, гэта значыць прыкладна да дзесяці гадзін раніцы, частка харугваў ВКЛ пусцілася наўцёкі, адпаведна, частка харугваў Фрыдрыха фон Валенрода іх праследавала, парушыўшы, такім чынам,

баявы строй. Так званы "Чыгізскі манускрыпт" паведамляе, што "...сышоўшыся ў бітве, ...бяззбройныя татары і літоўцы панеслі цяжкія страты, душылі (крыжакоў. — **Р.Г.**) аднак колькасцю, а не апорай на плечы палякаў. У жорсткай жа бітве пала людзей звыш меры, і стала відаць, што прусы не так хутка раны наносяць як самі ад татараў ці літоўцаў атрымліваюць. Цягнуўся бой каля гадзіны, калі самыя славутыя палі з абодвух бакоў, літоўцы, рускія і татары, як жывёлы, у ахвяру прыносіліся"[60].

Звесткі "Чыгізскага манускрыпта" пацвярджаюцца ананімнай польскай "Хронікай канфлікту...": "Іншая ж частка ворагаў сярод тых, самых лепшых людзей крыжакоў, сышлася з вялікім запалам і крыкамі з людзьмі Вітаўта, і пасля без малога гадзіны ўзаемнай бітвы страты вакол былі настолькі вялікія, што людзі князя Вітаўта вымушаны былі адступіць. Тады ворагі, праследваючы іх, вырашылі, што ўжо атрымалі перамогу і, парушыўшы баявы парадак, аддаліліся ад сваіх харугваў і шэрагаў сваіх атрадаў, і перад тымі, каго вымусілі бегчы, пачалі адыходзіць"[61]. Неабходна адзначыць, што войска ВКЛ панесла велізарныя страты — да паловы асабовага склада.

У гэтым выпадку апісанне, прадстаўленае "Хронікай канфлікту...", істотна адрозніваецца ад інфармацыі Я.Длугаша, які маляўніча апісаў уцёкі войска Вітаўта, з якога толькі "рускія рыцары Смаленскай зямлі зацята ваявалі, стоячы пад уласнымі трыма сцягамі. Адны толькі не пусціліся наўцёкі, і тым заслужылі вялікую славу. Хоць пад адным сцягам яны былі жорстка пасечаны, і сцяг іх быў утаптаны ў зямлю, аднак у двух астатніх атрадах яны выйшлі пераможцамі, ваюючы з найвялікшай адвагай, як і належала мужам і рыцарам, і, нарэшце, злучыліся з польскімі войскамі; і толькі яны адны ў войску Аляксандра Вітаўта здабывалі ў той дзень славу за адвагу і геройства ў бітве; усе ж астатнія, пакінуўшы палякаў ваяваць, кінуліся ўрассыпную ва ўцёкі, якія праследваюцца ворагам"[62].

Гэтае паведамленне Я.Длугаша прывяло да з'яўлення ў рускай дарэвалюцыйнай, а таксама савецкай гістарыяграфіі пераканання ў тым, што смаленскія палкі адыгралі вырашальную ролю ў Грунвальдскай бітве і выратавалі становішча сваёй мужнасцю, прадухіліўшы паражэнне саюзных войскаў[63].

Варта адзначыць, што калі паставіцца да інфармацыі польскага храніста з мінімальнай доляй крытычнасці, то можна выявіць суцэльныя супярэчнасці, якія выступаюць у нестыкоўцы часу і месца апісваемых падзей.

Напрыклад, першапачаткова Я.Длугаш згадваў, што ў войску Вітаўта знаходзілася толькі адна смаленская харугва, а не тры[64]. Па ўсёй верагоднасці, смаленская харугва знаходзілася на стыку крыла Вялікага княства Літоўскага і пазіцый, якія займалі польскія харугвы (што стала вядома Я.Длугашу з вусных крыніц), адкуль была адціснута разам з харугвай Святога Георгія і харугвай пярэдняй варты да польскіх атрадаў падчас прарыву атрадамі Фрыдрыха фон Валенрода баявога пастраення войска Вітаўта і ўцёкаў часткі атрадаў ВКЛ. У любым выпадку, гаварыць пра "лёсавызначальны" ўплыў на ход бітвы з боку смаленскіх ваяроў няма абсалютна ніякіх падстаў.

Падчас адыходу часткі харугваў ВКЛ і пачатку іх праследавання крыжакамі, прыкладна ў дзесяць гадзін раніцы, у бітву ўступілі польскія атрады, рушылі ў напрамку да Грунвальда, і сышліся з харугвамі крыжакоў, якія ўвёў у бой вялікі комтур Тэўтонскага ордэна Конрад фон Ліхтэнштэйн. Польскай атакай крыжакі былі адкінуты ад сваіх гармат.

Далей завязаўся жорсткі бой, падчас якога адбылося злучэнне рэшткі харугваў Фрыдрыха фон Валенрода з клінамі Конрада фон Ліхтэнштэйна з боку крыжакоў і рэштак войска Вітаўта з пярэдняй лініяй польскіх атрадаў з боку саюзнікаў. Дадзенае становішча лагічна выцякае з паведамлення "Хронікі канфлікту...", паводле якога крыжакі, "...што стаялі з левага боку ад тых, што былі адрэзаны, засталіся ў жывых, вярнуліся да сваіх людзей ад войскаў саперніка і, ізноў злучыўшыся, сышліся з вялікай харугвай кашталяна кракаўскага, ваяводы сандамірскага, зямлі Вялюньскай, зямлі Галіцкай і шматлікімі іншымі харугвамі. У гэтай сутычцы разгарэўся вельмі жорсткі бой, і таму тады шматлікія палі"[65].

Падчас наступнай фазы бітвы адбываецца вяртанне рыцараў войска Ордэна, якія пусціліся праследаваць уцекачоў з харугваў Вітаўта. Яны тут жа былі заціснуты з флангаў другой і трэцяй лініямі польскіх кліноў і пакінутых на полі бою харугваў Вялікага княства Літоўскага, адбылося іх акружэнне і знішчэнне або паланенне.

Прыкладна ў шаснаццаць гадзін у бітве наступіў пералом — частка харугваў крыжакоў адышла да свайго лагера.

Спрабуючы выправіць крытычнае становішча, Ульрых фон Юнгінген у гаі на поўдні ад вёскі Грунвальд зрабіў перагрупоўку рэзервовых харугваў, дапаўняючы іх адступіўшымі ваярамі, і асабіста павёў іх у бітву.

Рэзерв крыжакоў, у якім, верагодна, пераважала гарадская пяхота, як гэта вынікае з інфармацыі як "Чыгізскага манускрыпта", так і "Хронікі канфлікту...", прайшоў з правага флангу войскаў, якія сышліся ў бітве, і выйшаў прама да ўзгорка, дзе знаходзіўся Ягайла. Магчыма, такім чынам Ульрых фон Юнгінген планаваў здзейсніць флангавы абыход і зайсці ў тыл да праціўніка. У "Хроніцы канфлікту..." чытаем: "...сабраўшы тады сілы для вяртання ў бой, магістр з пакінутымі людзьмі, маючы з сабою пятнаццаць ці больш харугваў, з аднаго невялікага ляска пажадаў накіраваць свае атрады супраць караля; і ўжо дзіды, і пікі зняўшы з плячэй, паклалі на шчыты і сталі па месцах, жадаючы даведацца, дзе зручней найбольш паспяхова сысціся з ворагам"[66].

Падчас падыходу рэзервных харугваў да месца, дзе знаходзіўся Ягайла, адзін з рыцараў Тэўтонскага ордэна здзейсніў напад непасрэдна на польскага караля і быў забіты: "Тады адзін добра ўзброены

рыцар з Тэўтонскага ордэна, які хацеў у паядынку павярнуць каня свайго супраць караля, пад'ехаў бліжэй да яго. Кароль жа, схапіўшы ў руку сваю дзіду, смяротна параніў яго ў твар, у той жа час ён, іншымі з каня скінуты, зваліўся на зямлю мёртвым"[67].

Далей Ульрых фон Юнгінген здзейсніў атаку ў кірунку каралеўскай стаўкі, дзе завязаўся жорсткі бой: "...харугвы магістра са свайго месца выступілі супраць караля, натыкнуліся на вялікую харугву і мужна біліся коп'ямі"[69].

Як сведчыць працяг хронікі Яна фон Пасільге, "...магістр разам са сваімі людзьмі тройчы прабіваўся скрозь іх, і кароль так адступіў, што яны ўжо пачалі спяваць "Хрыстос уваскрос"[70].

У Я.Длугаша дадзены момант, дапоўнены сведчаннямі сучаснікаў, знайшоў адлюстраванне ў наступным выглядзе: "тым часам як крыжакі сталі напружваць усе сілы да перамогі, вялікі сцяг польскага караля Уладзіслава з белым арлом (якое нёс Марцін з Врацімавіц, харунжы кракаўскі, рыцар герба Полуказы) пад варожым націскам падае на зямлю. Аднак дзякуючы вельмі дасведчаным і заслужаным рыцарам, якія былі пры ім і тут жа затрымалі яго падзенне, сцяг паднялі і ўзнялі на месца"[71].

Аднак войскі саюзнікаў, якія ажыццявілі знішчэнне ці паланенне рыцараў, што вярнуліся з праследавання ўцекачоў з харугваў ВКЛ, перастроіўшы баявыя шэрагі, ахапілі з флангаў уведзены ў бой Ульрыхам фон Юнгінгенам ордэнскі рэзерв, часткова знішчылі яго, забіўшы магістра і ордэнскую верхавіну. У "Хроніцы канфлікту..." адзначана так: "...у першай жа сутычцы магістр, маршал і комтуры ўсяго Тэўтонскага ордэна былі забіты".

Пра гэта сведчыць і працяг хронікі Яна фон Пасільге: "...але прыйшлі яго госці і наёмнікі, калі яны не былі пастроены да бою, і напалі з аднаго боку, а язычнікі — з іншага, і акружылі іх, і людзі магістра і вялікія саноўнікі і вельмі шмат братоў Ордэна — усе загінулі. Вярнуўшыся, яны захапілі іншых, як братоў, так і коней"[72].

Крыжакі, якія засталіся ў жывых, ратуючыся ўцёкамі, дасягнулі свайго лагера: "...тыя ж, хто ацалеў, убачыўшы, што магістр, маршал і іншыя саноўнікі Ордэна загінулі, пусціліся наўцёкі і вярнуліся ў хуткім часе да свайго лагера, які быў раскладзены раней"[73].

У заключнай фазе бітвы саюзныя войскі ўзялі штурмам лагер крыжакоў, умацаваны калёсамі па прынцыпе "вагенбурга" і праследавалі ўцякаючых ў паўночным кірунку ворагаў. У праследаванні прыняў асабіста ўдзел Ягайла, як гэта вынікае з яго лістоў. Праследаванне ўцекачоў скончылася прыкладна а дзевятай ці дзесятай гадзіне вечара.

Такога паражэння Тэўтонскі ордэн яшчэ не ведаў. Саюзнікі захапілі 51 варожы сцяг[74]. На полі бою застаўся амаль цалкам камандны састаў крыжакоў. Сярод іх вялікі магістр Ульрых фон Юнгінген, маршал ордэна Фрыдрых фон Валенрод, вялікі комтур Куна фон Ліхтэнштэйн, торуньскі комтур Ёхан фон Зэйк, граф ліўскі Ёхан фон Вендэ і інш.[75].

Агульную лічбу загінуўшых як з польска-літоўскага, так і з крыжацкага боку падлічыць немагчыма. Верагодна, страты склалі не менш чым па некалькі тысяч забітых у абодвух арміях — толькі Эльблонг страціў 550 чалавек[76]. Аднак у крыжакоў страты па-



*Бітва пад Грунвальдам.*
Малюнак Ю.Косака.

вінны былі быць большымі, чым у саюзнікаў, што вынікае з ліста Ягайлы да сваёй жонкі, напісанага ў наступны дзень пасля бітвы: "пасля чаго... пачалі бой, у якім сярод незлічоных забітых, самі вельмі нязначныя маючы страты... вялікага магістра і маршала, Шварцбурга і эльблонгскага і многіх іншых комтураў крыжацкіх пасяклі, другіх да ўцёкаў прымусілі і асабіста праследваць пачалі"[77].

Паражэнне ў Грунвальдскай бітве істотна падарвала моц Тэўтонскага ордэна. Яго лепшае рыцарства засталося на полі бою. Але смерць вялікага магістра не прынесла канчатковай перамогі саюзнікам. Спачатку паспяховы паход па Прусіі скончыўся няўдачай пад Мальбаркам.

Падышоўшы 25 ліпеня да сталіцы Ордэна, саюзнае войска пачало яе аблогу[78]. Абаронай Мальбарка кіраваў комтур Свецэ Генрых фон Плаўэн, які пазней стаў вялікім магістрам Тэўтонскага ордэна. Зробленая ім спроба заключыць мірны дагавор не прынесла поспеху[79]. Аднак не здолеўшы дасягнуць мэты дыпламатычным шляхам, ён дасягнуў яе шляхам ваенным.

Саюзнікі не здолелі захапіць Мальбарк. Напрыканцы верасня Ягайла спыніў беспаспяховую аблогу і вярнуўся дамоў[80]. Гэта дазволіла Генрыху фон Плаўэну правесці вярбоўку наёмнікаў і працягваць вайну[81]. Вайсковыя дзеянні скончыліся заключэннем перамір'я ў Рацёнжы ў снежні 1410 г., у выніку якога крыжакі здолелі вярнуць сабе большую частку сваіх уладанняў у Прусіі[82].

У лютым 1411 г. паміж Ягайлам і Вітаўтам, з аднаго боку, і Генрыхам фон Плаўэнам, з другога, быў падпісаны мірны дагавор у Торун. Згодна з яго ўмовамі Польскае каралеўства вярнула Тэўтонскаму ордэну ўсе захопленыя ў вайне землі Прусіі і пакідала іх, кароль таксама адпускаў на волю ўсіх людзей магістра і Ордэна, захопленых у бітвах.

Тэўтонскі ордэн павінен быў выплаціць Ягайлу ў тры тэрміны (24 чэрвеня, 29 верасня і 11 лістапада) сто тысяч коп шырокіх пражскіх грошаў (6 000 000 грошаў). Жамойць заставалася ў складзе ВКЛ, але пасля смерці Ягайлы і Вітаўта павінна была перайсці да Ордэна[83]. Добжыньская зямля заставалася ў Польшчы, Памор'і, Міхалоўская і Хелмская землі — у крыжакоў. Пытанне аб спрэчных памежных замках Сантоке і Дрэздэнке перадаваліся на разгляд камісіі з 12 чалавек, абраных каралём і магістрам, ці на суд папы рымскага[84].



*Я.Сухадольскі. Пасля Грунвальдскай бітвы.* Першая палова XIX ст.

Вялікая вайна і Грунвальдская бітва выклікалі вялікі грамадскі рэзананс у Еўропе. Ян Гус у лісце да Ягайлы пісаў: "Калі пасол вашай вялікасці Онеш з Гворкі прынёс звесткі аб перамозе і слаўным міры — такая вялікая радасць агарнула маё сэрца, што ні пяром апісаць яе немагчыма, ні словамі выказаць... Дзе ж іхнія мячы, коні, людзі панцырныя, ўзброеныя, у якіх яны так верылі? Дзе незлічоныя флорыны і скарбы? Усё страцілі..."[85].

Па свайму размаху і вынікам Грунвальдская бітва з'яўлялася адной з буйнейшых у гісторыі сярэдневяковай Еўропы. Моц Тэўтонскага ордэна была падарвана, а яго вайсковы патэнцыял цяпер значна саступаў польскаму і літоўскаму.

Умовы Торуньскага міру не маглі задаволіць усіх патрэб саюзнікаў, што выклікала працяг дыпламатычнай і ваеннай барацьбы. У 1414 г. адбыўся яшчэ адзін польска-літоўскі паход у Прусію, які таксама не прынёс вырашэння спрэчных пытанняў.

Адносіны паміж бакамі заставаліся напружанымі, што вылілася ў вайну, якую Польскае каралеўства і ВКЛ аб'явілі ордэну ў 1422 г. Крыжакі пазбягалі бітваў у адкрытым полі і адышлі пад абарону муроў сваіх крэпасцяў. Значна саступаючы ў вайсковым плане праціўніку і пазбаўленыя дыпламатычнай падтрымкі імператара Свяшчэннай Рымскай імперыі Сігізмунда Люксембурга, які быў заняты ў гэты час барацьбой з гусітамі, крыжакі вымушаны былі пайсці на падпісанне пагаднення ў Мельне.

Мельненскім мірам скончылася барацьба ВКЛ з Тэўтонскім ордэнам за Жамойць. Згодна дамове пры вызначэнні межаў паміж ВКЛ і Ордэнам асноўная частка Жамойці і Судаў канчаткова злучылася з княствам[86].

Гэтая вайна па сутнасці была апошняй вайной ВКЛ з крыжакамі. Пасля смерці Вітаўта ў 1430 г. ВКЛ не распачынала актыўных крокаў для змены ўмоў пагаднення ў Мельне[87]. Пасля 1422 г. барацьбу з Ордэнам праводзіла толькі Польскае каралеўства. Выкарыстаўшы канчатковы ўнутраны развал дзяржавы крыжакоў, які адбыўся пасля стварэння ў 1440 г. Прускага антыордэнскага саюза, яно пачало ў 1454 г. так званую Трынаццацігадовую вайну. У выніку вайсковых дзеянняў Польскае каралеўства вярнула сабе некаторыя землі і канчаткова падпарадкавала Тэўтонскі ордэн, які ў 1466 г. прыняў у дачыненні да яго васальныя абавязкі[88].

---

[1] Górski K. Jana Długosza Banderia Prutenorum. W-wa, 1958. S. 223.

[2] Семянчук А.А. Беларуска-Літоўскія летапісы і польскія хронікі. Гродна, 2000. С. 58.

[3] Górski K. Jana Długosza Banderia Prutenorum.

[4] Длугош Ян. Грюнвальдская битва. М.-Л., 1962.

[5] Гагуа Р. Грюнвальд в источниках: "Хроника конфликта Владислава, короля Польши, с крестоносцами в год Христов 1410". Пинск, 2009. С. 138.

[6] Franciscani Thorunensis Annales Prussici (941—1410) // Scriptores rerum Prussicarum / hrsg. von T. Hirsch, M. Töppen, E.Strehlke. Leipzig, 1866. B. 3. S. 314—316.

[7] Johanns's von Posilge officials von Pomesanien, Chronic des landes Preussen (von 1360 an, fortgesetzt bis 1419) // Scriptores rerum Prussicarum / hrsg. von T. Hirsch, M. Töppen, E.Strehlke. Leipzig, 1866. B. 3. S. 314—316.

[8] Зутис Я. Грюнвальд — конец могущества Тевтонского ордена // Исторический журнал. 1941. № 9. С. 76.

[9] Жюгжда Ю.И. Борьба литовского народа с немецкими рыцарями в XII—XV веках // Исторический журнал. 1943. № 8—9. С. 29—30.

[10] Там жа. С. 29—30.

[11] Lowmiański H. Prusy-Litwa-Krzyżacy. W-wa, 1989. S. 188.

[12] Пичета В.И. Вековая борьба польского народа с немецкими захватчиками // Исторический журнал. 1941. № 9. С. 70.

[13] Зутис Я. Грюнвальд — конец могущества Тевтонского ордена. С. 77.

[14] Из Кревской унии (1385) // Хрестоматия по истории средних веков / Под ред. Н.П.Грацианского, С.Д.Сказкина. С. 172.

[15] Пичета В.И. Литовско-польские унии и отношение к ним литовской шляхты // Сборник статей, посвящённый В.О.Ключевскому. М., 1909. С. 143—161.

[16] Длугош Ян. Грюнвальдская битва. С. 44—45.

[17] Biskup M. Grunwaldzka bitwa. Geneza — przebieg — znaczenie — tradycje. Wyd. 1. W-wa, 1991. S. 30.

[18] Там жа.

[19] Lowmiański H. Prusy-Litwa-Krzyżacy. S. 217.

[20] Там жа.

[21] Длугош Ян. Грюнвальдская битва. С. 46.

[22] Там жа. С. 52—54.

[23] Там жа. С. 48.

[24] Там жа. С. 49.

[25] Там жа. С. 49.

[26] Possilge J. Chronik des Landes Preussen // Scriptores rerum Prussicarum / hrsg. von T. Hirsch, M. Töppen, E.Strehlke. Leipzig, 1866. B. 3. S. 301.

[27] Длугош Ян. Грюнвальдская битва. С. 49.

[28] Там жа. С. 50—57.

[29] Там жа. С. 199.

[30] Там жа. С. 60.

[31] Possilge J. Chronik des Landes Preussen. B. 3. S. 305.

[32] Длугош Ян. Грюнвальдская битва. С. 61.

[33] Там жа. С. 61—71.

[34] Там жа. С. 84—85.

[35] Там жа. С. 73.

[36] Там жа. С. 84.

[37] Там жа. С. 75—76.

[38] Там жа. С. 79.

[39] Там жа. С. 83—84.

[40] Дельбрюк Ганс. История военного искусства в рамках политической истории. Т. 3. СПб, 1996. С. 165.

[41] Там жа. С. 150.

[42] Biskup M. Grunwaldzka bitwa. Geneza — przebieg — znaczenie — tradycje. S. 55.

[43] Грамота польского короля Ягайло о привилегиях феодалам за переход в католическую веру // Хрестоматия по истории Белоруссии. Мн., 1997. С. 23—25.

[44] Тараторин В. История боевого фехтования. Мн., 1998. С. 248—249.

[45] Das Soldbuch des Deutchen Ordens 1410/1411. Köln-Wien, 1988.

[46] Zapiska z roku 1417 z Kroniki miasta Elbląga // Grunwald. 550 lat chwały. W-wa, 1960. S. 66.

[47] Дельбрюк Ганс. История военного искусства в рамках политической истории. Т. 3. С. 164.

[48] Гагуа Р. Грюнвальд в источниках: "Хроника конфликта Владислава, короля Польши, с крестоносцами в год Христов 1410". Пинск, 2009.

[49] Там жа.

[50] Kuczyński S. Wielka Wojna z Zakonem Krzyżackim w latach 1409—1411. Wyd. 2. W-wa, 1960. S. 244—246; Biskup M. Grunwaldzka bitwa. Geneza — przebieg — znaczenie — tradycje. S. 50; Греков И.П. Русские земли в XIII—XV вв. // Мир истории. М., 1988. С. 234.

[51] Кирпичников А.Н. Военное дело на Руси в 13—15 вв. Ленинград, 1976. С. 3—18.

[52] Biskup M. Grunwaldzka bitwa. Geneza — przebieg — znaczenie — tradycje. S. 23—24.

[53] Гагуа Р.Б. О тактическом ходе сражения при Грюнвальде // Свежий ветер 99: сб. науч. работ студентов Гр.ГУ им. Янки Купалы / под ред. А.И.Буть. Гродно, 1999. С. 93—95.

[54] Длугош Ян. Грюнвальдская битва. С. 87—95.

[55] Зутис Я. Грюнвальд — конец могущества Тевтонского ордена. С. 79.

[56] Cronica conflictus Wladislai regis Poloniae cum cruceferis anno Christi 1410 // Scriptores rerum Prussicarum. Leipzig, 1866. S. 20—25.

[57] Длугош Ян. Грюнвальдская битва. С. 109.

[58] Там жа. С. 128.

[59] Там жа. С. 102.

[60] Der Bericht der Chigi'schen Handschrift // Scriptores rerum Prussicarum. Leipzig, 1870. B. 4. S. 235.

[61] Cronica conflictus Wladislai regis Poloniae cum cruceferis anno Christi 1410. S. 438.

[62] Длугош Ян. Грюнвальдская битва. С. 102.

[63] Гагуа Р.Б. Российская и белорусская историография сражения при Грюнвальде // Весн. Гродн. дзярж. ун-та імя Я.Купалы. Сер. 1. Гуманітарныя навукі. 2003. № 2 (20). С. 15—22.

[64] Длугош Ян. Грюнвальдская битва. С. 91.

[65] Cronica conflictus Wladislai regis Poloniae cum cruceferis anno Christi 1410. S. 438.

[66] Там жа.

[67] Там жа.

[68] Там жа.

[69] Johanns's von Posilge officials von Pomesanien, Chronic des landes Preussen (von 1360 an, fortgesetzt bis 1419). S. 316.

[70] Длугош Ян. Грюнвальдская битва. С. 104.

[71] Cronica conflictus Wladislai regis Poloniae cum cruceferis anno Christi 1410. S. 438.

[72] Johanns's von Posilge officials von Pomesanien, Chronic des landes Preussen (von 1360 an, fortgesetzt bis 1419). S. 316.

[73] Cronica conflictus Wladislai regis Poloniae cum cruceferis anno Christi 1410. S. 438.

[74] Dlugosz J. Banderia Pruthenorum. W-wa, 1958.

[75] Длугош Ян. Грюнвальдская битва. С. 113.

[76] Zapiska z r. 1417 z "Kroniki miasta Elbląga". S. 64—65.

[77] List Władysława Jagiełły do królowej Anny // Grunwwald. 550 lat chwały. W-wa, 1960. S. 57—59.

[78] Длугош Ян. Грюнвальдская битва. С. 120.

[79] Там жа. С. 124—125.

[80] Там жа. С. 132.

[81] Там жа. С 128—129.

[82] Там жа.С. 132.

[83] Там жа. С. 153—154.

[84] Там жа. С. 206—207.

[85] Z listu Jana Husa do Jagiełły ozwyciectwie grunwaldskim // Grunwald. 550 lat chwaly. W-wa, 1960. S. 60—61.

[86] Дундулис Б.И. Дипломатическая и вооруженная борьба Литвы против Тевтонского ордена и ее союз с гуситами в 1410—1422гг.: Автореф. дис. канд. ист. наук. Вильнюс, 1955. С. 11.

[87] Там жа. С. 13.

[88] Biskup M. Wojna Trzynastoletnia i powrót Polski nad Baltyk w 15 wieku. Kraków, 1990.